

# ДА 65-ГОДДЗЯ
# СВЯТЛАНЫ АНДРЭЕЎНЫ КОШУР

**Дарагая Святлана Андрэеўна!**

На працягу многіх гадоў мы, Вашы калегі па пісьменніцкай арганізацыі ўспрымаем Ваша імя і Ваш вобраз нястомнай рупліўцы, прынцыповага змагара за гістарычную праўду з пачуццём шчырай удзячнасці за Вашу працу па вывучэнні гісторыі роднага краю, па захаванні яго багатай культурнай спадчыны. Вашы кнігі можна па праве лічыць не толькі скарбніцамі каштоўных ведаў, але і сапраўднымі падручнікамі па патрыятызму і гуманізму. Сардэчна віншуем Вас з 65-годдзем. Жадаем Вам здароўя і душэўнага спакою, добрага настрою і поспехаў у творчасці. Няхай жа няўмольны час не абцяжарвае Ваш шлях па жыцці, а толькі служыць сакральнай ніткай гісторыі, здольнай прывесці да новых адкрыццяў. **З ЮБІЛЕЕМ!**

Калектыў
Гродзенскага абласнога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

*2 студзеня 2023 года*
***Гродна-Карэлічы***

